# З НОВЫМ ГОДАМ, ДАРАГІЯ СЯБРЫ!




# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

*№ 7 (192) 23 снежня 1992 г., серада*


## Святочныя інтэрв´ю

**Напярэдадні Новага года рэдакцыя задала сваім чытачам традыцыйныя пытанні:**

**1. Чым быў знамянальны для Вас год адыходзячы, які след пакінуў ён у Вашым жыцці і жыцці Вашых калег?**

**2. Чаго Вы жадаеце ад Новага года, якія надзеі ўскладваеце на яго? Што Вы пажадалі б чытачам «Гродзенскага універсітэта»?**

### *А. В. Бадакоў,* *РЭКТАР УНІВЕРСІТЭТА, ПРАФЕСАР*

1. Адыходзячы 1992 год быў вельмі няпростым для універсітэта, яго калектыву — прафесарска-выкладчыцкага саставу, аспірантаў, супрацоўнікаў і студэнтаў. Галоўнай задачай для нас было — рухаючыся па шляху аптымізацыі якасці падрыхтоўкі спецыялістаў і павышэння эфектыўнасці навукова-даследчых работ — знайсці свой шлях, свой стыль выжывання і развіцця, стварыць перадумовы прыймальнага для ўсіх нас заўтрашняга дня, будучага. І гэта ў асноўным нам удалося.

Быў зроблены выпуск высокакваліфікаваных спецыялістаў, ажыццёўлены прыём першакурснікаў — дастойнага папаўнення студэнцкай сям´і. Пачата падрыхтоўка кадраў па новых спецыяльнасцях — міжнародныя эканамічныя адносіны і міжнароднае права, музыкант-педагог і мастак-педагог кансерватарна-акадэмічнага плана. Матэрыяльная база універсітэта папоўнілася новым абсталяваннем, пераважна персанальнымі камп´ютарамі, прыступілі да ўкаранення інфармацыйных тэхналогій навучання.

Зроблены значныя крокі ў выкананні Закона Рэспублікі Беларусь аб мове, устаноўлена супрацоўніцтва з некаторымі універсітэтамі ЗША.

У 1992 годзе пачалося будаўніцтва сталовай на вуліцы Даватара, завяршаецца праектаванне універсітэцкага гарадка. За кошт перадачы універсітэту фізкультурнага тэхнікума значна палепшана вучэбная база па фізічнаму выхаванню.

12 супрацоўнікаў абаранілі кандыдацкія дысертацыі, працягваўся прафесіянальны рост усіх катэгорый работнікаў. І яшчэ я хацеў бы сказаць аб той значнай праграме камерцыйнай дзейнасці, якая намі ажыццяўлялася ў 1992 годзе.

У выніку, нягледзечы на агульны крызіс, універсітэт паспяхова выконвае сваю місію, нарошчваючы якасць і эфектыўнасць сваёй дзейнасці. І я, карыстаючыся прадастаўленай магчымасцю выступіць у нашай газеце, выказваю сваю шчырую падзяку выкладчыкам, студэнтам, супрацоўнікам, кіраўнікам усіх структур, якія садзейнічалі нашаму руху наперад.

2. У 1993 годзе нам трэба вырашаць яшчэ больш складаныя праблемы. Назаву некаторыя з іх:

1. Адкрыць падрыхтоўку спецыялістаў сумесна з Дайтонскім і Чыкагскім універсітэтамі для рынкавай эканомікі Рэспублікі Беларусь. Размова ідзе аб менеджэрах, фінансістах, аб прафесіяналах у галіне маркетынгу і міжнароднага права.

2. Асвоіць і ўкараніць сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі навучання.

3. Адкрыць пры універсітэце 2 эканоміка-прававыя ліцэі і вышэйшую школу бізнесу.

4. Сфарміраваць факультэт замежных студэнтаў як крыніцу валютных паступленняў.

5. Завяршыць будаўніцтва сталовай-інтэрната, знайсці падрадчыка для будаўніцтва універсітэцкага гарадка па вул. Каліноўскага.

6. Ажыццявіць мадэрнізацыю навучальнага працэсу ў сувязі з пераходам на шматступенчатую сістэму адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

7. Прадоўжыць пераарыентацыю дзейнасці універсітэта ў сувязі з паскораным пераходам рэспублікі да рынку.

8. Працягваць нарошчваць камерцыйную дзейнасць з такім разлікам, каб яна стала дадатковым сродкам сацыяльнай абароны нашых супрацоўнікаў.

9. Грунтоўна разгарнуць навукова-даследчую працу вучоных і студэнтаў з тым, каб яна адказвала патрабаванням рэгіёна і павялічвала заробкі выкладчыкаў і студэнтаў.

10. І, галоўнае, гэта навучыцца ўсім не стаяць на месцы, выпрацаваць у сябе імкненне да абнаўлення, і перш за ўсё сваёй працы ці вучобы, шукаць адказы на праблемы, якія ставіць жыццё, і няўхільна рухацца наперад.

У заключэнне я сардэчна, шчыра і як толькі магчыма цёпла віншую ўсіх маіх калег і студэнтаў, рабочых і аспірантаў з каляднымі святамі, Новым, 1993 годам, які, я на гэта спадзяюся, прынясе кожнаму з нас больш шчаслівае жыццё!

**Хай збудуцца Вашы планы і хай бароніць вас Лёс і Бог!**

### *В. М. Чарапіца,* *ДЭКАН ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА, ПРАФЕСАР*

1. Асаблівага задавальнення кожны з нас, бадай, не зведаў: па-ранейшаму навокал цяжкасці, дарагавізна, няўпэўненасць. Але не пакідае аптымізм.

Для мяне асабіста год запомніўся тым, што выйшла нарэшце мая кніжка «Вытокі» — нарысы з гісторыі руска-беларуска-польскіх люцыйных і культурных сувязяў XIX — пачатку XX стагоддзяў. Гэта вынік даследчай працы на працягу некалькіх гадоў. Зразумела, што адначасова з прыемным ёсць і пачуццё незадаволенасці навуковымі даследаваннямі. Хацелася зрабіць значна больш. У апошні час займаюся праблемамі гістарыяграфіі, працую над тэмай «Беларусь у працах рускіх дарэвалюцыйных гісторыкаў». Думаю, што новае выданне атрымаецца цікавым і будзе карысным.

Насычаным і складаным быў год і для факультэта ў цэлым. Асвойвалі спецыяльнасць «замежная мова». Распрацавалі новыя вучэбныя планы, зрабілі на гэтым шляху пэўныя крокі. Хвалявалі нас унутраныя праблемы і самой гістарычнай навукі. Патрабуецца творчы перагляд усяго, што было раней засвоена. А пошукі новага, як вядома, заўсёды ідуць цяжка, з некаторай унутранай барацьбой і з самім сабой. Відавочна, ад нечага трэба адказвацца, хоць зрабіць гэта нялёгка.

Але гэтая з´ява часовая. У нас працуюць сумленныя, кваліфікаваныя выкладчыкі, кожны з іх адчувае сваю адказнасць за лёс гістарычнай навукі. Праўда, некаторым даецца гэта няпроста. Радуе тое, што даволі выразна гучыць на факультэце беларуская мова.

2. Зыходзячы са зробленага ў 1992 годзе, вызначаем кола праблем і надзей на будучы год. Відавочна, поспех сам не прыйдзе. Як дэкана, вельмі турбуе, якім будзе факультэт, як перайсці на шматузроўневую сістэму навучання. Зрабіць гэта будзе няпроста, калі мець на ўвазе нашу спецыялізацыю — падрыхтоўку студэнтаў па замежных мовах.

Выкананне планаў будзе залежыць ад палітычнага клімату як у Беларусі, так і ў бліжэйшым замежжы. Хацелася б, каб усе мы не шукалі прычын сваіх цяжкасцяў дзесьці на баку, у суседзяў.

І яшчэ. Упэўнены, што і ў новым годзе ў нас на факультэце па-ранейшаму будзе здаровы мікраклімат, шчырыя адносіны паміж супрацоўнікамі і студэнтамі. Добрыя традыцыі будзем развіваць. А гэта дае падставу глядзець у будучыню з аптымізмам.

Мае пажаданні чытачам: здароўя, шчасця і плёну ва ўсім.

## Шануем спадчыну

### *З III навуковых чытанняў у гонар Я. Карскага*

Пяць гадоў назад, калі на кафедры рускай мовы з´явілася ідэя праводзіць навуковыя чытанні ў гонар нашага славутага земляка акадэміка Я. Карскага, мала хто верыў у яе здзяйсненне. Першыя два гады, 1988 і 1989, чытанні праходзілі вяла. Адчувалася, што гэта нейкі прымус, крыху спрацоўвала і інерцыя абыякавасці.

Ініцыятары прыйшлі да высновы: каб прымус ператварыўся ў жаданне, трэба чытанні зрабіць вядомымі па-за межамі універсітэта, а матэрыялы друкаваць. Трэба павысіць аўтарытэт чытанняў, як таго патрабуе аўтарытэт і самога Я. Карскага, і яго навуковай і грамадскай дзейнасці.

І вось у 1990 годзе, на 130-я ўгодкі з дня нараджэння Я. Карскага, на чытанні ў яго гонар прыязджаюць унучка вучонага Таццяна Сяргееўна Карская, даследчык яго творчасці доктар філалагічных навук М. Г. Булахаў, вучоныя з Мінска, Вільнюса, Гомеля. Адразу ж, праз два тыдні, былі выдадзены матэрыялы чытанняў. На тытульным лісце лічылася — Першых чытанняў, для нас, арганізатараў, яны былі ўжо трэція.

У 1991 годзе ў падрыхтоўцы Другіх чытанняў прыняла ўдзел абласная бібліятэка імя Я. Карскага, з бюджэту якой былі выдзелены сродкі на выданне матэрыялаў. Пашырылася і тэматыка дакладаў, і геаграфія ўдзельнікаў. Зборнік «Шануючы спадчыну Я. Карскага» пайшоў за межы Беларусі. Ім зацікавіліся некаторыя універсітэты ЗША.

Ужо на Другіх чытаннях удзельнікі выказалі думку, што чытанні павінны адлюстроўваць не толькі спадчыну вучонага, але і здабыткі тых, хто служыць той жа справе, якой служыў слаўны сын зямлі гродзенскай — даследаванню і развіццю Яе Вялікасці Філалогіі. Тым больш што навуковыя інтарэсы акадэміка мелі энцыклапедычны размах — ад палеаграфіі да методыкі выкладання моў у гімназіі.

На ўдзел у Трэціх чытаннях, што адбыліся 14 снежня гэтага года, прыслалі заяўкі вучоныя з усіх буйных гарадоў Беларусі (асабліва актыўны быў Брэст, 9 заявак), дзяржаў СНД: Масквы, Днепрапятроўска, Кемерава, Луцка, Нежына. Чытанні зрабіліся міжнароднымі: у іх прынялі ўдзел госці з Вільнюса, Гданьска. І гэта пры жорсткай умове: удзел у чытаннях і друкаванне матэрыялаў пацвярджаюць абавязковай прысутнасцю дакладчыка. І людзі прыехалі. Супрацоўнік Акадэміі навук Беларусі В. К. Шчэрбін на абмеркаванні дакладаў заўважыў: «Гродна (чытай — Гродзенскі універсітэт) ў навуковых адносінах стаў прэстыжным. Нам, мінчанам, робіцца няёмка за сваю пасіўнасць». Госці прывезлі і свае кнігі: берасцейцы — дыялекталагічны зборнік «Жывое народнае слова» (Мн.: Навука і тэхніка, 1992), прафесар Л. В. Судавічэне — падручнік па рускай мове для літоўцаў (Вільнюс, 1992).



На здымку: аўтар кнігі пра Я. Карскага краязнаўца А. П. Цыхун, прафесар М. І. Канюшкевіч і прафесар Вільнюскага універсітэта Л. В. Судавічэне.

Калі планаваліся гэтыя чытанні, мелася на ўвазе, акрамя даследавання спадчыны Я. Карскага, вывучыць праблему: функцыянальны аспект супастаўляльных даследаванняў моў. Распрацоўка гэтай тэмы фінансуецца універсітэтам, і даклады па ёй на чытаннях — пачэсная форма справаздачы выканаўцаў, а заадно і праверка на якасць, бо тэорыя поля аб´яднала лінгвістаў у адну з актыўнейшых секцый, настолькі актыўных, што гаспадарам чытанняў не хапіла часу на чытаннях і дыскусія прадоўжылася на паміжкафедральным лінгвістычным семінары 16-га снежня.

Потым высветлілася (гэтага таксама чакалі арганізатары), што праблематыка чытанняў значна пашырылася. Але шматграннасць спадчыны Я. Карскага яднала ўсіх. Таму з цікавасцю слухалі на пленарным пасяджэнні госці і гаспадары (а сярод іх

(Працяг на 2-й стар.)

# Народныя абрады

## З ГІСТОРЫІ СВЯТКАВАННЯ КАЛЯД І НОВАГА ГОДА

Зімовае навагодняе свята сфарміравалася толькі ў познім сярэднявеччы. Да гэтага часу адносіцца святкаванне каляд — народнага зімовага свята дахрысціянскага паходжання. За калядамі замацаваўся час (стары стыль) з 24 снежня (нараджэнне Хрыста) па 6 студзеня (вадохрышча) ўключна. Для абраднасці каляд характэрны тры абрадавыя вячэры (куцці): посная (вялікая) спраўляецца перад першым днём свята, багатая (тоўстая, шчодрая, мясная) перад Новым годам і посная (галодная, вадзяная) перад вадохрышчам. Абавязковай стравай была ўласна куцця — ячная каша. Калядікі пераапраналіся, надзявалі маскі «казы», «мядзведзя», «жорава», «каровы» і інш., абыходзілі хаты і выконвалі велічальныя песні. За гэта ім давалі дарункі (сала, каўбасы).

У калядныя дні, у вечар перад Новым годам (с. ст., на другую куццю, шчодрую, мясную), адбывалася шчадраванне: дзяўчаты хадзілі па хатах са «шчодрай» (прыгожай дзяўчынай, якая была святочна апранута, на галаве — папяровы вянок з рознакаляровымі стужкамі) і выконвалі шчадроўскія песні, якія ўслаўлялі гаспадара, гаспадыню, іх дзяцей.

Напярэдадні Новага года пашыраны былі варажба, розныя павер ´і і прыкметы:

— зорнае неба на куццю абяцала ўраджай на ягады, грыбы ў новым годзе;

— іней на дрэвах — багатую квецень у садах;

— снег і мяцеліца — знак таго, што ўлетку будуць добра раіцца пчолы.

У аснове такіх уяўленняў, павер ´яў ляжыць сімільная магія.

Пазней, у капіталістычную эпоху, на Беларусі распаўсюджваўся звычай ставіць навагоднюю ёлку. Ёй пакланяліся, імкнуліся ўлагодзіць, задобрыць дрэва, яго жыццёвую сілу, якая нібыта магла садзейнічаць чалавеку, урадлівасці поля, дабрабыту сям ´і. Паступова рэлігійны сэнс абрадаў пачаў знікаць. Зялёная ўпрыгожаная ёлка стала сімвалізаваць жыццё, здароўе, шчасце. Упрыгожаная ёлка паступова ператваралася ў галоўны сімвал Новага года. Адбыліся некаторыя змены і ў саставе навагодніх масак-персанажаў: з ´явіліся Дзед Мароз і Снягурачка.

Такім чынам, у параўнанні з былой мінуўшчынай адбыліся значныя змены ў комплексе навагодніх абрадаў і звычаяў. Амаль страціўся магічны сэнс. Новы год стаў самым папулярным народным святам.



Першы снег. Фотаэцюд У. Сарокіна.

СПОРТ

# Падвялі вынікі

Святочны вечар, прысвечаны падвядзенню спартыўных вынікаў 1992 года, адбыўся нядаўна ў нашым універсітэце. Ён сабраў вялікую колькасць і гледачоў, і ўдзельнікаў. Сярод ганаровых гасцей былі алімпійскія чэмпіёны — уладальніца залатога медаля ў Токіо па спартыўнай гімнастыцы, зараз старшы выкладчык кафедры тэорыі і методыкі фізічнага выхавання Алена Валчэцкая і самы першы чэмпіён Барселоны, навучэнец вучылішча алімпійскага рэзерву стралок Канстанцін Лукашык.

Вядучы вечара — намеснік загадчыка кафедры фізвыхавання В. А. Чэкель запрасіў на сцэну таксама ўладальніка Кубка свету, бронзавага прызёра чэмпіяната СССР па вольнай барацьбе, студэнта 4 курса факультэта фізічнай культуры Алега Гогаля, заслужанага трэнера СССР, кандыдата педнавук, загадчыка кафедры В. А. Максімовіча, акадэміка Расійскай акадэміі імя Цыялкоўскага А. І. Яроцкага, іншых ганаровых гасцей.

Алена Валчэцкая расказала прысутным аб далёкім Токіо, а Канстанцін Лукашык падзяліўся ўражаннямі аб Барселонскай алімпіядзе гэтага года, аб тым, як ён у цяжкай барацьбе аказаўся мацнейшым: В. А. Максімовіч пажадаў маладому алімпійскаму чэмпіёну новых спартыўных поспехаў і стаць у будучым годзе студэнтам універсітэта. Вячаслаў Аляксандравіч спыніўся таксама на дасягненнях барцоў універсітэта на рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтвах. Дарэчы, ён з ´яўляецца старшым трэнерам вобласці па грэка-рымскай барацьбе.

Цёпла быў сустрэты Алег Гогаль, які вярнуўся нядаўна з паездкі ў ЗША і падзяліўся сваімі ўражаннямі.

Старшыня гарадскога спорткамітэта В. М. Чыгірынаў уручыў каштоўныя прызы капітану гандбольнай каманды універсітэта і вобласці Наталлі Цівер, членам нацыянальнай каманды рэспублікі па грэка-рымскай барацьбе Аляксандру Сідарэнку і Валерыю Віленцю.

Затым былі ўручаны пераходныя кубкі за перамогу ва ўнутрыўніверсітэцкай спартакіядзе студэнтам факультэта правазнаўства, матэматычнага і інжынернага факультэтаў.

Самымі актыўнымі ўдзельнікамі спартакіяды прызнаны студэнтка 4 курса факультэта правазнаўства Зінаіда Чупік і студэнт 4 курса інжынернага факультэта Валеры Мышкевіч.

У заключэнне вечара адбыліся паказальныя выступленні нашых лепшых спартсменаў, спаборніцтвы па армрэстлінгу, перацягванню каната. Мацнейшым у барацьбе на руках аказаўся студэнт юрфака Сяргей Фядулаў, па перацягванню каната не было роўных, як і год назад, студэнтам факультэта фізічнай культуры. У якасці ўзнагароды яны атрымалі «салодкі» прыз. У конкурсе газет зноў вызначыліся юрысты і «салодкі» прыз аказаўся ў руках рэдактара і мастака Зінаіды Чупік.

А завяршыла свята дыскатэка. На думку многіх вечар атрымаўся цікавым і карысным. Хацелася б, каб і ў новым годзе нашы спартсмены радавалі ўсіх і высокімі дасягненнямі, і прыемным адпачынкам.

**І. БЕЛАВОКІ,**
**начальнік спартклуба.**



**На здымку: С. Фядулаў атрымлівае пераходны кубак за перамогу факультэта правазнаўства ў спартакіядзе.**
**Фота М. БАНДАРЭНКІ, студэнта 4 курса.**

## ВЯРНУЛІСЯ З МЕДАЛЯМІ

У Мінску прайшоў аб ´яднаны чэмпіянат свету па барацьбе самба сярод жанчын і мужчын, юніёраў і юніёрак. Удала выступілі спартсмены нашага універсітэта. Студэнт 3 курса факультэта фізічнай культуры Валера Лерман упэўнена перамог усіх сапернікаў і заваяваў залаты медаль. Яго калега, першакурснік Юры Лысенка атрымаў бронзу. Таксама бронзавы медаль дастаўся студэнту 3 курса факультэта правазнаўства Аляксандру Багдзевічу.

На юнацкім першынстве свету студэнт 2 курса факультэта фізічнай культуры Сяргей Круцько заваяваў сярэбраны медаль.

Падрыхтаваў спартсменаў да спаборніцтваў старшы выкладчык кафедры фізвыхавання І. Э. Шарко.

**Б. ІВАНЮК.**

# Ноч пад Новы год

Замкнула зямля свой ящчэ адзін круг,
Другі зачынае.
Маўчыць непрытульна заснежаны луг
І пушча лясная.
Мігаюць далёкія зоры ўгары,
Як чыстыя росы,
І ходзіць паважна мароз па бары,
Злы, белавалосы.
Глядзіць неласкава скляпенне нябёс
На скутую зямлю,
І Млечнага Шляху паблеклы пракос
У холадзе дрэмле.
У гэтым змярцвенні начной цішыні
Год Новы вітаю.
— Якою пуцінай вы пойдзеце, дні?—
Я моўчкі пытаю.
Маўчыць неабсяжны прастор — глыбіня
Без берагу-краю.
Маўчыць з ім і постаць наступнага дня
І я замаўкаю.

**Якуб Колас.**

# ЖАРТОЎНЫЯ АБ ´ЯВЫ НАПЯРЭДАДНІ НОВАГА ГОДА

### ЗНАЁМСТВЫ

Прыгожая бландзінка, 20 гадоў, рост 168, адукацыя рознабаковая, характар паўночны, мае кватэру ў лесе, любіць казкі, падарункі, катацца на лыжах і каньках. Спадзяецца пазнаёміцца з Дзедам Марозам узросту не болей як 3.334 гады.

### ПАСЛУГІ

Паважаныя Дзяды Марозы! Адміністрацыя хімчысткі робіць вам напамінак, што прынесенае пазней як 2 студзеня 1993 года футра прымацца не будзе!

### АБМЕН

Арганізацыя мяняе трох Дзядоў Марозаў на адну Снягурачку — маладую, сімпатычную і незалежную, якая ўмее гатаваць абеды, мыць бялізну, прасаваць, а таксама не ўжывае спіртнога.

### КУПЛЮ

...новае футра замежнай вытворчасці, у якім не сорамна было б сустракаць Новы год.

### УВАГА! КОНКУРС

Малое прадпрыемства «Ласкавы студзень» аб ´яўляе конкурс «Міс Снягурачка». Просьба кандыдатак да 1 студзеня 1993 года даслаць на наш адрас аўтабіяграфію, даведку з апошняга месца работы ці вучобы, дзве фотакарткі — у профіль і анфас, а таксама 1 рубель адной купюрай на арганізацыю конкурса. Грошы, выпушчаныя ў 1961 годзе, просьба не прапаноўваць.

### ЗАПРАШЭННІ

Кааператыў «Чакайце добрага надвор ´я!» запрашае Снягурачку і Дзеда Мароза з аўтамашынай маркі «Форд» і цягнікам падарункаў.

# АНЕКДОТЫ З БАРАДОЙ І БЕЗ

### У МАГАЗІНЕ

Пераднавагодні вечар. Старэнькая жанчына пытае ў харчовым магазіне:

— У вас ёсць сэрвелат?

— Няма.

— А кракаўская каўбаса?

— Няма.

— А доктарская?

— Не завозяць.

— Дык мо тады хоць грамаў трыста ліверкі?

— Ну і памяць жа ў цябе, бабуля!

### НАВАГОДНІ ПАДАРУНАК

— Якое цудоўнае футра! — усклікнула суседка, калі на хвілінку забегла да сяброўкі зірнуць на навагоднія падарункі і ўбачыла яе каля люстэрка ў шыкоўнай шубцы.— Колькі ж гэта табе каштавала?

— Адзін пацалунак.

— Які ты падаравала мужу?

— Не, які ён падараваў сваёй сакратарцы, калі я, не пастукаўшыся, зазірнула ў яго кабінет.

**Сабрала**
**Н. АСТРАВУХ.**

Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404, тэл. 44-72-97

Газета выходзіць два разы на месяц. Аб´ём газеты — адзін друкаваны аркуш

Наклад 2 000 асобнікаў

Газета надрукавана афсетным способам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4. Падпісана ў друк у 15.00.

Зак. 5286

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: ВУЧОНАЯ РАДА УНІВЕРСІТЭТА, ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ, ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ

В. а. рэдактара У. П. АМЕЛЬКА